# ПЛАНІРОЎКА ЗАМКАВЫХ ТЭРЫТОРЫЙ У ВЯЛІКІМ КНЯСТВЕ ЛІТОЎСКІМ



**С.А. ПАЦЫЕНКА,**
*аспірантка БДУ культуры і мастацтваў*

Абарончае дойлідства ў Вялікім княстве Літоўскім фарміравалася на працягу некалькіх стагоддзяў. Змяненні і ўдасканаленні ў замкавай архітэктуры адбываліся пад уздзеяннем новых дасягненняў у навуцы. Так, да XV ст. на тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага былі вядомы два тыпы замкаў: разнастайныя па абрысах (на ўзвышшах), план якіх паўтараў канфігурацыю рэльефу (Наваградскі, Гродзенскі; мал. 1), і размешчаныя ў нізінах звычайна з рэгулярнай планіроўкай і выкарыстаннем равоў з вадой (Крэўскі, Лідскі; мал. 2). Аднак з цягам часу замкавыя пабудовы пачалі адрозніваццa такой разнастайнасцю, што іх класіфікаванне зрабілася даволі праблематычным. Тым не менш, адноснае падабенства аб'ядноўвае ўсе замкі, што дае магчымасць пошуку іх агульных рыс. Мы прапануем звярнуць увагу на планіроўку і прызначэнне замкавай прасторы.

Сёння вельмі цяжка дакладна выявіць размяшчэнне тых ці іншых пабудоў на замкавых тэрыторыях. Яшчэ большую складанасць у даследчыкаў выклікаюць спробы выявіць прызначэнне памяшканняў у замках. Аднак узнаўленне планіроўкі замкавых тэрыторый магчыма. І праводзіцца яно некалькімі шляхамі. Так, плённым з'яўляецца **аналіз рэшткаў**, а таксама рэканструкцыя замкаў, створаных на аснове даследаванняў археолагаў, гісторыкаў, гісторыкаў архітэктуры, мастацтвазнаўцаў і іншых. Такая праца дазваляе даведацца, напрыклад, пра падзел замкавай прасторы, мэту і час стварэння і пераробак пабудоў, прасачыць характар і паходжанне ўплываў культуры іншых краін і г.д.

Шмат карысных звестак утрымліваюць вынікі археалагічных даследаванняў. Асабліва гэта тычыцца сацыяльна-эканамічнага жыцця замкавага насельніцтва. Менавіта праца археолагаў можа патлумачыць прыналежнасць і прызначэнне замкавых пабудоў, сацыяльны ўзровень іх жыхароў і г.д.

Пры ўзнаўленні замкавай планіроўкі можна праводзіць аналогіі з іншымі будынкамі адзначанага тыпу і перыяду, якія размяшчаліся па-за тэрыторыяй Вялікага княства Літоўскага. Асабліва



*Мал. 1.* Стары гродзенскі замак. Сучасны выгляд. Фота К.К. Шастоўскага



*Мал. 2.* Лідскі замак. Малюнак Я. Куліка

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

цікавымі для даследавання з'яўляюцца замкі краін Скандынавіі, Цэнтральнай і Заходняй Еўропы. Улічваючы факт запазычання, можна звярнуцца да аналагічных ордэнскіх замкаў, тым больш, што падзел іх унутранай прасторы быў абумоўлены спецыяльнымі прадпісаннямі ордэнскага статута, які захаваўся да нашых часоў [3].

Асаблівую ўвагу будаўнікі рыцарскіх замкаў надавалі прыбіральням (данскерам). Гэтыя памяшканні рабіліся з дрэва ці каменю ў выглядзе крытага балкона альбо асобна размешчанай вежападобнай пабудовы. Данскеры знаходзіліся за замкавымі мурамі каля рова і злучаліся з замкам спецыяльным калідорам-галерэяй. Побач звычайна былі прадугледжаны шлюзы для напаўнення вадой абарончага рова. Дзве «коморки потребные», як называлі прыбіральні нашыя продкі, знаходзіліся на паўднёвай і ўсходняй сценах Лідскага замка [6]. Гэта былі цагляныя данскеры на каменных фігурных кансолях.

Вялікая колькасць каштоўнай інфармацыі ўтрымліваецца ў разнастайных гістарычных дакументах, летапісных крыніцах, архіўных матэрыялах і г.д. Асаблівы інтарэс для даследчыкаў прадстаўляе **інвентар**. У некаторых вопісах змяшчаюцца падрабязныя звесткі пра замкі — ад апісання архітэктуры і планіроўкі да пераліку маёмасці і ўзроўню гаспадаркі.

На наш погляд, тэрыторыю кожнага замка можна ўмоўна падзяліць на тры зоны. Першая, **абарончая,** знаходзілася ў распараджэнні абаронцаў замка — вайсковага гарнізона. Другую, **гаспадарчую,** зону займала княжацкая чэлядзь, слугі, прадстаўнікі замкавых служб. Трэцяя, **княжацкая**, зона належала гаспадару замка — князю, буйному феадалу, а таксама іншаму замкаваму кіраўніцтву. Кожная з трох узгаданых груп насельніцтва займала ўласную прастору, што атрымала выразнае адлюстраванне ў замкавай планіроўцы.



*Мал. 3.* Крэўскі замак. Здымак пачатку XX ст.

Рэшткі архітэктурных помнікаў, шматлікасць археалагічных знаходак ваеннага прызначэння сведчаць, што **першапачаткова дамінуючай у замкавых пабудовах была абарончая зона**. Яна ахоплівала замкавыя сцены, апошні паверх веж, баявыя пляцоўкі на самым іх версе. У некаторых замках яна займала і самі вежы (прыкладам можа служыць Мірскі замак). Абарончая зона таксама праходзіла па замкавым двары, дзе размяшчалася жыллё воінаў. Напрыклад, на тэрыторыі Лідскага замка аднапавярховыя драўляныя казармы шырынёй каля 4 метраў былі пабудаваныя ўздоўж трох сцен. Перагародкамі яны падзяляліся на асобныя памяшканні, кожнае з якіх ацяплялася ўласнай кафляной печчу [1, с. 51]. Менавіта тут жылі салдаты замкавага гарнізона.

Замкі будаваліся такім чынам, што яны не толькі ахоўвалі насельніцтва пабудовы ад варожых замахаў, але і давалі магчымасць актыўна адбівацца падчас наступаў. У больш ранніх замках (Крэўскі, Лідскі) лучнікі і арбалетчыкі вялі агонь праз байніцы, якія размяшчаліся ў верхняй зоне сцен (мал. 3). Трапіць да байніц можна было па лесвіцах, якія выходзілі на баявую галерэю-памост, пабудаваную ўздоўж усёй лініі байніц.

З удасканаленнем зброі адбыліся змены ў абарончай архітэктуры, якія закранулі і планіроўку замкавых сцен. Сцены больш позняга Мірскага замка ўтрымліваюць аж тры ярусы бою (мал. 4). Ніжняя зона — гарматныя байніцы падэшвеннага бою ў выглядзе камер-пячор [5, с. 42]. Сярэдні ярус — калідор-галерэя, размешчаная ўсярэдзіне сцен. На верхнім, трэцім, ярусе размяшчалася баявая пляцоўка, прыкрытая парапетамі з байніцамі.

У абарончых мэтах выкарыстоўваўся таксама апошні паверх веж. У некаторых



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



*Мал. 4.* Мірскі замак. Унутраны двор

замках над ім быў яшчэ адзін ярус бою — баявыя пляцоўкі, размешчаныя на самым версе вежы. Ва ўжо ўзгаданым замку ў Міры вежы завяршаліся байніцамі-машыкулямі, праз якія абаронцы лілі вар альбо смалу, кідалі каменне.

Ад стану абарончай зоны залежала жыццё ўсіх жыхароў замка. У тыя неспакойныя часы, калі бяспека была вялікай прывілеяй, баявая гатоўнасць нярэдка выратоўвала жыцці цэлых паселішч. Таму клопату па ўтрыманні і своечасовым рамонце замкавых умацаванняў надавалася вельмі вялікая ўвага, што было замацавана нават на дзяржаўным узроўні. Для жыхароў Вялікага княства Літоўскага афіцыйна прадугледжваліся разнастайныя павіннасці па ўтрыманні і абслугоўванні абарончых пабудоў. Акрамя вайсковага гарнізона замкі павінны былі абараняцца мясцовымі ваеннаабавязанымі людзьмі. Адным з артыкулаў Статута Вялікага княства Літоўскага 1588 г. нават забаранялася ваяводам, старостам і дзяржаўцам самастойна набіраць наёмнікаў і выкарыстоўваць іх працу ў замках, якія абараняліся мясцовымі ваеннаабавязанымі [4].

Гаспадарчая, як і абарончая, зона была абавязковай для любой замкавай будовы. Без яе не выстаяў бы ніводзін замак. Менавіта гаспадарчая частка замка рабіла магчымым яго функцыянаванне як самастойнага жыллёвага цэнтра. Яна ахоплівала тэрыторыю замкавага двара, сутарэнні ў вежах, а таксама ніжнія паверхі палацаў.

Гаспадарчыя пабудовы, якія размяшчаліся на замкавым двары, часцей за ўсё ўяўлялі сабой аднапавярховыя драўляныя будынкі. Яны выкарыстоўваліся для захавання запасаў харчовых прадуктаў, адзення, разнастайнай маёмасці, зброі, прылад працы і інш. Запасы ежы пастаянна папаўняліся, каб замак не стаў лёгкай здабычай для нечаканага ворага. Летапісныя крыніцы нярэдка ўзгадваюць голад і смагу як прычыны здачы замкаў. Жыхары замкавых пабудоў уважліва клапаціліся як аб наяўнасці, так і аб добрым захаванні запасаў. Для гэтага выкарыстоўвалі разнастайныя кладоўкі, каморы, склады, арсеналы, лямусы. Вядома, напрыклад, што на тэрыторыі Лідскага замка знаходзіўся двух'ярусны лямус на мураваным сутарэнні. Для захавання найбольш каштоўных рэчаў прызначаліся скарбніцы. Мяркуючы па колькасці знойдзеных на замкавых дварах ключоў і замкоў, некаторыя гаспадарчыя пабудовы зачыняліся. Верагодна, у першую чаргу гэта датычылася скарбніц і арсеналаў (цэйхгаўзаў). Гэтыя будынкі былі прызначаны для захавання зброі і боепрыпасаў, а таксама — іх вырабу і рамонту. Арсенал мог падзяляцца на асобныя памяшканні, дзе захоўваліся неабходныя для абароны лукі, арбалеты, халодная зброя, пазней — ручныя стрэльбы, запасы ядраў, пораху, куль і г.д.

Пасля перабудовы Гродзенскага Старога замка ў 80-х гг. XVI ст. на замкавым двары з'явіліся арсенал і лазня (мал. 5). Увесь двор быў шчыльна заняты драўлянымі службовымі і гаспадарчымі пабудовамі, а таксама дамамі замкавых слуг. У Крэўскім замку жылыя і гаспадарчыя пабудовы канцэнтраваліся на ўзвышанай паўночна-заходняй частцы двара. Сярод іншых пабу-

РЭПОЗІТОРЫЙ БГУКІ



*Мал. 5.* Макет эскізнага праекта рэстаўрацыі і прыстасавання Старога гродзенскага замка. Архітэктар У. Бачкоў

доў там знаходзілася кузня. На тэрыторыі замкавага двара ў Любчы размяшчаліся кухня, лазня, свіран, склеп, трапезная з каморамі і святліцамі, падклець, піўніца, бровар. У XVII ст. на передзамчы ў Міры звонку быў прыбудаваны шэраг мураваных гаспадарчых пабудоў. Паводле інвентара 1778 г. там знаходзіліся: стайня, вежачка для захавання фуражу, кузня, кухня, пякарня, бровар, лазня, кандытарская, памяшканне для захавання зброі, памяшканне для захавання дроў, шмат іншых разнастайных кладовак і складоў [6].

Такія гаспадарчыя пабудовы, як кухня, пякарня, звычайна абсталёўваліся ў асобным памяшканні ў замку ці, найчасцей, на замкавым двары. Кухня ў Мірскім замку размяшчалася нават звонку замкавых муроў і мела наступны выгляд: «Кухня на шасці мураваных слупах з вялікім комінам, выведзеным на двор, ачаг пад комінам таксама цалкам мураваны, у канцы за кухняй — кладоўка...» [6, с. 48]. Такое размяшчэнне выбіралася з мэтай перасцярогі ад пажару. Аднак падчас аблог драўляныя будынкі на замкавым двары вельмі часта гарэлі. Пасля таго, як нападзенне было адбіта, жыхары аднаўлялі на былых падмурках драўляныя пабудовы.

Першапачаткова непасрэдным месцам жылля ў замку былі вежы (за выключэннем прызначаных для абароны першага і апошняга паверхаў) і тэрыторыя замкавага двара. Падзел замкавай прасторы адлюстроўваў у сабе выразную саслоўную дыферэнцыяцыю. Прадстаўнікі вышэйшага саслоўя — князь, яго сям'я, начальнік замкавай варты — жылі ў вежах. Як правіла, яны займалі памяшканні на другім паверсе. Прыкладна з XVI ст. на замкавых дварах пачынаюць будавацца асобныя карпусы для знаці — палацы. Палац у Мірскім замку ўзнік у першым дзесяцігоддзі — другой палове XVI ст.; каля 1580 г. у Гродзенскім замку ўзвялі палац Стафана Баторыя; у канцы XVI ст. быў пабудаваны палац у Геранёнскім замку. Жыхары больш простага паходжання (салдаты гарнізона, княжацкая чэлядзь і іншая прыслуга) жылі ў драўляных пабудовах на замкавым двары. Тут таксама было жыллё рамеснікаў (збройнікаў, ганчароў, будаўнікоў, краўцоў, кавалёў, ювеліраў і г.д.), якія сваёй працай задавальнялі практычна ўсе патрэбы жыхароў замка.

**Княжацкая** зона адрознівалася багаццем і найбольшым камфортам. Пакоі княжацкіх памяшканняў мелі высокія столі і ўяўлялі сабой прасторныя залы з вялікімі (у параўнанні з астатнімі памяшканнямі) вокнамі. Вокны былі зашклёныя, аб чым сведчаць знаходкі аконнага шкла на замкавых тэрыторыях. Да XIV—XV стст. адносяцца фрагменты шыб з Лідскага замка. Яны былі аздоблены ніткамі малочнага шкла [1]. У Мірскім замку акрамя звычайнага аконнага шкла быў знойдзены нават фрагмент «распіснога танкасценнага вітража, магчыма, венецыянскай работы» [2, с. 65].

Значную ролю ў аздабленні інтэр'ераў княжацкай зоны адыгрывала падлога. Яна мела розны характар пакрыцця. Падлога магла быць паркетнай (Мірскі, Нясвіжскі замкі) альбо выкладзенай з разнастайных па форме і колеры керамічных плітак (Гродзенскі, Мірскі замкі). У Гродзенскім замку Стафана Баторыя акрамя керамічнай пліткі ў аздабленні падлогі быў выкарыстаны мармур. Своеасаблівым упрыгожаннем замкавых інтэр'ераў з'яўляліся печы і каміны, аздобленыя адмысловай кафляй.

Сцены княжацкіх пакояў і залаў у замках XIV—XV стст. упрыгожваліся фрэскавым роспісам (Трокскі, Крэўскі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

замкі). У больш позніх прыватна-уласніцкіх замках яны пакрываліся мармурам, лепкай (Мірскі замак), аздабляліся шпалерамі. Сцены пакояў Гродзенскага палаца Стафана Баторыя былі ўпрыгожаны шліфаваным гіпсам, кафляй і разьбою. У Нясвіжскім замку дызайн сцен утвараўся дубовымі разнымі панелямі, палатнянымі і скуранымі шпалерамі ў ляпных пазалочаных рамах. Сцены адной з залаў Гальшанскага замка ўпрыгожваў багаты жывапіс.



*Мал. 6.* Нясвіжскі замак. Унутраны двор

Пачатак XVI ст. у Вялікім княстве Літоўскім быў адзначаны актыўным будаўніцтвам прыватных замкаў — рэзідэнцый заможных феадалаў. Архітэктура такіх замкаў, як Мірскі, Геранёнскі, Нясвіжскі (мал. 6), Гальшанскі, адрознівалася асаблівай дэкаратыўнасцю, прадстаўнічасцю. Княжацкая зона паступова пачала дамініраваць над астатнімі, выцiснуўшы абарончую і гаспадарчую зоны на другі план. На замкавых тэрыторыях сталі з’яўляцца будынкі тэатраў, творы садова-паркавай архітэктуры і інш.

Такім чынам, з цягам часу падзел і прызначэнне прасторы ў замках Вялікага княства Літоўскага значна змяніліся. **Калі ў XIV — пачатку XV ст. асноўная ўвага надавалася пераважна абарончым якасцям, дык у XVI—XVIII стст. акцэнт перамясціўся ў бок рэпрэзентатыўнасці (выгляду), камфортнасці замкавай пабудовы.** Дзякуючы выкарыстанню дасягненняў еўрапейскай фартыфікацыі, адбылося выразнае адасабленне абарончай часткі замка ад жылой, рэпрэзентатыўнай. Абарончую функцыю пачалі выконваць бастыённыя ўмацаванні, вынесеныя за межы замкавых карпусоў, якія ў сваю чаргу ператварыліся ў рэпрэзентатыўнае жыллё беларускіх магнатаў. Паступова магутныя замкі-фартэцыі змяніліся прыгожымі палацава-паркавымі комплексамі.

1. Археологический отчет о проведении раскопок в Лидском замке в июле 1980 г.: кн. I—II. — Мн., 1980. — 75 с.

2. *Здановіч, Н.І., Краўцэвіч, А.К., Трусаў, А.А.* Матэрыяльная культура Міра і Мірскага замка. — Мн., 1994. — 183 с.

3. *Нейман, В.И.* Военное зодчество в Прибалтийском крае в средние века // Труды IX археологического съезда в Вильне. — 1893. — Т. 1.

4. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588. — Мн., 1989. — 573 с.

5. *Ткачоў, М.А.* Замкі Беларусі. — Мн., 1977. — 83 с.

6. *Mikulski, W., Zawadzki, J.* Opisy zamkyw biaioruskich z inwentarzy dybr przechowyanych w archiwum Radziwiiiyw w archiwum giywnym akt dawnych. — Warszawa, 1999. — 88 s.

**Ответы к кроссворду Л.И. Ионовой на с. 64.**

***По горизонтали:*** **1.** Шедевр. **6.** Сюита. **8.** Бельканто. **10.** Жирардо. **11.** Ромео. **12.** Рязанов. **14.** Лей. **15.** Лоу. **16.** Прадо. **17.** «Битлз». **19.** Па. **20.** Шелихин. **21.** Неаполь. **24.** Бергман. **26.** «Калинка». **27.** Ли. **29.** «Кармен». **30.** Очи. **31.** «Калитка». **34.** Фон. **35.** Ню. **36.** Лувр. **39.** Фото. **40.** «Метаморфозы». **44.** Бабий. **46.** Ода. **48.** Лик. **49.** Мадригал. **50.** Пимен.

***По вертикали:*** **2.** Елисей. **3.** Вермер. **4.** Блюз. **5.** Акын. **6.** Сорди. **7.** Тремоло. **8.** Бородин. **9.** Новелла. **13.** «АББА». **16.** Припев. **18.** Челлини. **19.** «Песняры». **20.** Шерлок. **21.** Неореализм. **22.** Пиано. **23.** Фламенко. **25.** Ге. **28.** Итака. **29.** Канио. **32.** Лученок. **33.** Ив. **37.** Руна. **38.** Уффици. **41.** Ми. **42.** Фетр. **43.** Зал. **44.** Бал. **45.** «Сон». **47.** Ра.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ